# § 43. Індыя

*1. Якая партыя ўзначаліла нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі ў міжваенны перыяд? 2. Які ўплыў на нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі аказала Другая сусветная вайна?*

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў Індыі пачаўся ўздым нацыянальна-вызваленчага руху. Лідары Індыйскага нацыянальнага кангрэса (ІНК) запатрабавалі ад Англіі поўнай незалежнасці. Барацьба супраць каланіяльных улад набыла сапраўды ўсенародны характар. Кампаніі негвалтоўнага супраціўлення літаральна захліснулі краіну. Брытанскае панаванне ў Індыі дажывала апошнія дні.

**Дасягненне незалежнасці.** Англія выдатна разумела ступень пагрозы і марнасць выкарыстання насілля. Яна вырашыла мірным шляхам перадаць уладу памяркоўным прадстаўнікам нацыянальнага руху. Перагаворы праходзілі ва ўмовах узрастання інфляцыі і народных маніфестацый пад кіраўніцтвам ІНК і яго лідараў Махатмы Гандзі і Джавахарлала Неру.

Англійскі план прадугледжваў падзел краіны па рэлігійным прынцыпе і стварэнне на яе тэрыторыі дзвюх дзяржаў — індускай і мусульманскай. Мусульманская ліга ўхваліла гэты план. Бо яна і сама імкнулася да стварэння ўласнай дзяржавы Пакістан («зямля чыстых»). Дж. Неру таксама дапускаў заснаванне мусульманскай дзяржавы, але толькі пры ўмове, што яна захавае з Індыяй федэратыўныя адносіны.

У 1946 г. у Індыі быў сфарміраваны ўрад Нацыянальнага кангрэса. Мусульманская ліга заклікала мусульман не падпарадкоўвацца гэтаму ўраду. Паміж індусамі і мусульманамі пачаліся крывавыя сутыкненні. У выніку Неру вымушаны быў пагадзіцца на падзел Індыі.

**Індыя — брытанскі дамініён.** *14 жніўня 1947 г.* уступіў у сілу *закон аб незалежнасці Індыі*. Яе тэрыторыя была падзелена на два дамініёны — *Індыйскі саюз* і *Пакістан* — фактычна незалежныя дзяржавы ў складзе Брытанскай імперыі. У *1949 г.* яны ўвайшлі ў Брытанскую Садружнасць, якая аб'яднала Вялікабрытанію і яе былыя дамініёны і калоніі, што сталі незалежнымі дзяржавамі.

Паколькі граніцы паміж дзвюма новымі дзяржавамі былі праведзены без уліку нацыянальных і рэлігійных асаблівасцяў, сыход англічан прывёў да абвастрэння адносін паміж індусамі і мусульманамі. Гэта супрацьстаянне суправаджалася маштабнымі перасяленнямі і ахвярамі. У *кастрычніку 1947 г.* паміж Індыяй і Пакістанам выбухнула вайна за кантроль над Кашмірам. 30 студзеня 1948 г. індусам-фанатыкам быў забіты М. Гандзі, які выступаў за мір паміж дзвюма дзяржавамі. Сікхскае

Правообладатель Издательский центр БГУ



Генерал-губернатар Індыі лорд Маўнтбетэн з жонкай і генерал-губернатар Пакістана М. А. Джына *(у цэнтры)*. 1947 г.

насельніцтва штата Пенджаб таксама апынулася падзеленым і стала патрабаваць прызнання сваёй аўтаноміі.

**Утварэнне рэспублікі. «Курс Неру».** У *1950 г.* уступіла ў сілу Канстытуцыя Індыі, згодна з якой краіна станавілася суверэннай парламенцкай рэспублікай і захоўвала сваё членства ў Садружнасці нацый.

Дзяржаўным будаўніцтвам незалежнай Індыі заняўся ***Джавахарлал Неру***. Перад ім стаяла цяжкая задача: пераадолець каланіяльнае мінулае і зрабіць Індыю сапраўды незалежнай дзяржавай. У аснову палітычнага *«курсу Неру»* была пакладзена канцэпцыя «індыйскага сацыялізму», якая прадугледжвала абмежаванне прыватнай уласнасці, прадухіленне нацыянальна-рэлігійнага разладу і сацыяльны кампраміс.

Урад Неру правёў рэформы ў эканоміцы і дзяржаўным кіраванні, нацэленыя на пераадоленне адсталасці і мадэрнізацыю краіны. Улады імкнуліся спалучаць прыватны і дзяржаўны сектары эканомікі. Развіццё цяжкай прамысловасці стварала эканамічную аснову для незалежнасці. З 1953 г. у краіне пачалася адміністрацыйная рэформа, накіраваная на рэарганізацыю тэрыторыі штатаў па нацыянальна-моўным прынцыпе.

У знешняй палітыцы Неру прытрымліваўся прынцыпаў мірнага суіснавання і недалучэння да ваенных блокаў. Індыя ўсталявала дружалюбныя адносіны з СССР, з дапамогай якога ажыццяўлялася індустрыялізацыя краіны. Узаемаадносіны з паўночна-ўсходнім суседам — КНР — былі напружанымі. У тыбецкім рэгіёне паміж дзвюма дзяржавамі адбываліся ваенныя сутыкненні.



Джавахарлал Неру са сваёй дачкой Індзірай Гандзі

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Індыі ў 1964 г. — пачатку XXI ст.** Смерць Дж. Неру ў 1964 г. прыявяла да актывізацыі ў ІНК правых сіл і выхаду іх з радоў партыі. Імкнучыся аднавіць папулярнасць ІНК, дачка Неру ***Індзіра Гандзі***, якая ўзначаліла з 1966 г. урад, абвясціла аб правядзенні ў краіне новых рэформаў. Яны ўключалі пашырэнне сферы дзяржсектара, абмежаванне

Правообладатель Издательский центр БГУ

дзейнасці манаполій, заахвочванне дробнага бізнесу. Аднак ва ўмовах дэмаграфічнага выбуху і засухі 1972—1975 гг. у краіне пагоршылася эканамічная сітуацыя. Пачаліся забастовачны рух і студэнцкія хваляванні. У выніку на ўсеагульных выбарах у парламент у 1975 г. большасць галасоў выбаршчыкаў атрымалі апазіцыйныя сілы. Яны змаглі пратрымацца на чале ўлады да 1980 г., калі перамогу на выбарах зноў атрымаў ІНК.

Новы ўрад І. Гандзі, заручыўшыся фінансавай падтрымкай Міжнароднага валютнага фонду, пайшоў на скарачэнне дзяржсектара і лібералізацыю эканомікі. Праўда, прынятыя меры прывялі толькі да павелічэння знешніх даўгоў. У гэты перыяд на пярэдні план выйшаў новы фактар палітычнага жыцця краіны — сепаратызм. На поўдні Індыі пачалі дзейнічаць тамільскія сепаратысты. Актывізаваліся сутыкненні паміж мусульманамі і індусамі ў штаце Джаму і Кашмір. У штаце Пенджаб з патрабаваннямі аддзялення ад Індыі выступілі сікхі, што прывяло да ўзброенага сутыкнення з урадавымі войскамі. 31 кастрычніка 1984 г. Індзіра Гандзі была забіта сікхамі-тэрарыстамі.

На парламенцкіх выбарах у студзені 1985 г. упэўненую перамогу атрымаў ІНК на чале з *Раджывам Гандзі*. У якасці першачарговай задачы ўрад абвясціў захаванне адзінства краіны. Была аб’яўлена таксама новая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця, накіраваная на лібералізацыю эканомікі. Адначасова па ініцыятыве Раджыва Гандзі з дапамогай СССР у Індыі ішло ўкараненне высокіх тэхналогій.

Аднак з прычыны імклівага росту насельніцтва ўзровень жыцця індыйцаў пагаршаўся. Усё большым уплывам у краіне стаў карыстацца блок правых палітычных партый. Вядучую ролю ў ім адыгрывала *«Бхаратыя Джаната парці» (БДП)*. Гэтая партыя стала галоўным апанентам ІНК. У канцы 1990-х — пачатку 2000-х гг. кааліцыя на чале з БДП здолела ненадоўга прыйсці да ўлады. Дзеля захавання сваіх пазіцый ІНК таксама вымушаны быў уступаць у кааліцыі.



Прэм’ер-міністр Індыі Раджыў Гандзі і прэм’ер-міністр Пакістана Беназір Бхута на саміце Паўднёва-Азіяцкай асацыяцыі рэгіянальнага супрацоўніцтва. 1989 г.

Незалежна ад палітычнай арыентацыі ўсе вядучыя партыі ўсведамлялі неабходнасць правядзення ліберальных рэформаў. Гэтым заняліся кааліцыйныя ўрады 1990-х гг. Рэформы прыкметна палепшылі становішча краіны. Спачатку тэмпы росту эканомікі складалі 3,9 %, у 2000 г. яны ўзраслі да 9 %. Цяпер Індыя ўмацоўвае золатавалютныя рэзервы і пашырае здабычу нафты. Паспяхова развіваецца і сельская гаспадарка: з 1992 г. Індыя экспартуе збожжа.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Краіна нарошчвае экспарт тавараў высокіх тэхналогій. Па колькасці высакакласных прафесійных кадраў у галіне камп’ютарнага праграмавання Індыя займае другое месца ў свеце.

Аднак перад краінай па-ранейшаму стаяць цяжкавырашальныя сацыяльна-эканамічныя праблемы. Адна з іх — аграрная перанаселенасць. Далейшае павелічэнне плошчы ворнай зямлі практычна немагчымае. Вострай сацыяльнай праблемай з’яўляецца няроўнасць у даходах: 20 % насельніцтва спажываюць больш як палову нацыянальнага даходу. Індыя ўсё яшчэ застаецца краінай масавай галечы, хоць колькасць жабракоў прыкметна паменшылася.

**Праблемы знешняй палітыкі.** Забеспячэнне міру, нацыянальнай бяспекі, абарона суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці з’яўляюцца асноўнымі задачамі знешняй палітыкі сучаснай Індыі. Першачарговае значэнне для іх вырашэння маюць адносіны з Кітаем, Пакістанам, ЗША і Расіяй.

Праблема ўзаемаадносін паміж Індыяй і КНР узнікла пасля акупацыі Кітаем Тыбета ў 1954 г. Паваротнай падзеяй стала заява новага кітайскага лідара Дэн Сяапіна пра тое, што пытанне аб межах з Індыяй павінна быць вырашана толькі мірным шляхам.

Асаблівае месца ў знешняй палітыцы Індыі займаюць адносіны з Пакістанам. Прычынай абвастрэння індыйска-пакістанскіх адносін (аж да вайны ў 1971 г.) стала несумяшчальнасць падыходаў абодвух бакоў да вырашэння пытання аб прыналежнасці штата Джаму і Кашмір. Лінія спынення агню, усталяваная пад эгідай ААН у 1949 г., падзяліла Кашмір на дзве часткі — індыйскую і пакістанскую. Аднак прэтэнзіі Пакістана на мусульманскую частку індыйскага Кашміра захаваліся дагэтуль. Індыйска-пакістанскія супярэчнасці ўскладняюцца наяўнасцю ў абодвух бакоў ядзернай зброі.

Яшчэ адзін важны напрамак знешняй палітыкі Індыі — амерыканскі. У гады «халоднай вайны» Індыя была лідарам Руху недалучэння і арыентавалася ў асноўным на СССР. Злучаныя Штаты, наадварот, падтрымлівалі Пакістан. Палітычнае збліжэнне паміж Індыяй і ЗША пачалося пасля візіту прэзідэнта Б. Клінтана ў Індыю ў 2000 г.



Цэнтр кіравання спадарожнікамі ISRO ў Хасане

Правообладатель Издательский центр БГУ

ЗША прызналі Індыю ў якасці ядзернай дзяржавы і знялі ўсе санкцыі, уведзеныя супраць яе раней.

Пасля дасягнення палітычнай незалежнасці Індыя ўсталявала дружалюбныя адносіны з СССР. Савецкі Саюз аказаў дапамогу ў стварэнні прадпрыемстваў у энергетычнай, нафтахімічнай, суднабудаўнічай і іншых галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Сімвалам савецка-індыйскай дружбы стаў Бхілайскі металургічны завод. Першы індыйскі спадарожнік быў запушчаны ў космас з дапамогай савецкай ракеты-носьбіта. Індыйская армія на 80 % была ўкамплектавана савецкай зброяй. Пасля развалу СССР Індыя страціла ў яго асобе надзейнага палітычнага саюзніка і дзелавога партнёра. Расійская Федэрацыя наладзіла з Індыяй адносіны, якія традыцыйна маюць дружалюбны характар.

1. Складзіце храналагічную табліцу атрымання Індыяй незалежнасці.
2. Якія праблемы неабходна было вырашыць краіне пасля атрымання незалежнасці?
3. У чым была сутнасць эканамічнай палітыкі Дж. Неру? Як вы думаеце, чаму ў рэгуляванні сацыяльных і эканамічных працэсаў значную ролю адыгрывала дзяржава?
4. Ахарактарызуйце палітычную сістэму Індыі. Якія партыі адыгрываюць вядучую ролю ў палітыцы? Назавіце найбольш значных, на ваш погляд, палітычных дзеячаў Індыі. Дайце ацэнку іх дзейнасці.
5. Якія сацыяльныя і нацыянальныя праблемы існуюць у сучаснай Індыі?
6. Якія асноўныя мэты і кірункі знешняй палітыкі Індыі? Якія нявырашаныя знешнепалітычныя праблемы стаяць перад краінай?

Індыя належыць да ліку самых шматпартыйных краін свету. Так, ва ўсеагульных выбарах удзельнічаюць каля 300 палітычных партый, сярод якіх да 10 — усеіндыйскія. Чым вы можаце патлумачыць такі шырокі спектр палітычных плыняў?

**Індзіра Гандзі** (1917—1984) — дзяржаўны дзеяч, лідар Індыйскага нацыянальнага кангрэса, адзіная жанчына — прэм'ер-міністр Індыі. Дачка Джавахарлала Неру. Яе дзед быў блізкім паплечнікам Махатмы Гандзі. У 12 гадоў узначаліла рух дзяцей, якія марылі пра незалежнасць Індыі. Індзіра Гандзі атрымала адукацыю ў Індыі, Швейцарыі, Вялікабрытаніі. Насуперак традыцыям заключыла шлюб з чалавекам не сваёй касты. Садзейнічала актыўнаму развіццю краіны. Пры ёй была запушчана першая АЭС, краіна ўрэшце стала незалежнай ад імпарту прадуктаў харчавання. Паводле версіі апытання брытанскай тэлерадыёвяшчальнай карпарацыі «Бі-бі-сі» ў 1999 г., Індзіра Гандзі стала «Жанчынай тысячагоддзя».



Правообладатель Издательский центр БГУ